**УДК 323 “17”**

## СА ШТОДЗЁННАГА ЖЫЦЦЯ ПОЛАЦКА – ЗАПІС ВОЗНАГА ІВАНА СКІРМАНТА АБ “БУНЦЕ ПОЛАЦКІХ МЯШЧАН” У 1621 г.

***д-р гіст. навук, праф., В.Ф. ГОЛУБЕЎ***
**Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Мінск**

*У 20-х гг. XVII ст. на Полаччыне і Віцебшчыне адбывалася выразнае супрацьстаянне ў грамадстве, звязанае з канфесійнымі прыхільнасцямі розных груп насельніцтва. У многім яно было звязана з дзейнасцю полацкага ўніяцкага архіепіскапа Іасафата Кунцэвіча (1618–1623). Падзеі, апісаныя ў публікуемым дакуменце, карэлююцца па часе з Віцебскім паўстаннем 1623 г. і іншымі антыўніяцкімі выступленнямі на ўсходзе Беларусі. Не выключана, што і “Полацкі бунт” 1621 г., звесткі пра які знойдзены сярод матэрыялаў уніяцкай царквы, мае рэлігійную падаснову.*

У Літоўскім дзяржаўным гістарычным архіве ў складзе фонда “Літоўская грэка-ўніяцкая кансісторыя” быў выяўлены цікавы дакумент пра мінулае г. Полацка, якому мы далі ўмоўную назву “Запіс вознага Івана Скірманта аб “бунце полацкіх мяшчан” у 1621 г.” [1, р. 7–8]. Дакумент напісаны на старабеларускай мове і ўяўляе сабой выпіс з гродскіх кніг Віцебскага ваяводства ад 3 чэрвеня 1621 г. Поўны тэкст дакумента прыводзіцца на мове арыгінала напрыканцы артыкула. Вынасныя літары пазначаны курсівам. Літара “ъ” не перадавалася.

У гэтым выпісе апавядаецца аб спрэчцы, якая адбылася паміж жыхарамі (мяшчанамі) г. Полацка (“мужчынамі і нявестамі”) і полацкім ваяводам князем Міхалам Друцкім-Сакалінскім. Супрацьстаянне дасягнула кульмінацыі 21 мая 1621 г., калі полацкі ваявода адправіў свайго прадстаўніка, “енерала”[1] Івана Скірманта, каб той перадаў мяшчанам копію “заручнага ліста”[2] [2] князя Друцкага-Сакалінскага. На жаль, з тэкста дакумента не ўдалося вызначыць прычыну супрацьстаяння жыхароў горада і прадстаўніка вышэйшай дзяржаўнай улады ў ваяводстве. Разам з тым, “запіс Івана Скірманта” сведчыць аб высокім узроўні самаарганізацыі насельніцтва г. Полацка ў першай палове XVII ст., аб існаванні своеасаблівай грамадзянскай супольнасці ў горадзе ўжо ў тыя далёкія часы. У дакуменце гаворыцца пра патаемныя ад уладаў сходы, якія праводзілі полацкія мяшчане (“схажки покутные”). Улада якраз і спрабавала спыніць гэтыя сходы, адзначаючы, што раней такога не было (“пере*д* ты*м* того николи не бывалы*х”)* і патрабуючы, каб мяшчане такіх сходаў больш не рабілі і падпарадкаваліся ўладам (“абы тых схажок покутных… занехали и бунто*в* жа*д*ны*х* бол*ш* не чынили”) [1, р. 7]. У тэксце ўпамінаюцца службовыя асобы і шляхта (полацкі ваявода князь Міхал Друцкі-Сакалінскі, віцебскі падваявода Аляксандр Гурко, енерал Полацкага ваяводства Іван Скірмант, возны Полацкага ваяводства Ян Пнеўскі, служэбнік князя Друцкага-Сакалінскага пан Аляксандр Жахоўскі, шляхціцы пан Васіль Раманавіч, пан Марцін Юрэвіч), а таксама простыя жыхары г. Полацка, мяшчане Ігнат Вішня, Лук’ян Лукашэвіч. У тэсце упамінаецца царкоўная служба (“литоргия”), якая праходзіла ва ўніяцкім на той час Полацкім Сафійскім саборы – “в церкви соборной Светое Софии” 30 мая 1621 г.

Асноўныя падзеі, якія апісваліся ў дакуменце, адбываліся ў мая 1621 г. у г. Полацку на вуліцы Вялікай у доме полацкага мяшчаніна Ігната Вішні. Уражвае колькасць удзельнікаў пратэстнай акцыі – некалькі соцень чалавек (“Та*м* же знашо*л* е*с*ми великое згромаженье люде*й* музчызн и неве*ст* ѡ ко*л*ко сот чоловека” [1, р. 7]. Гараджане былі дастаткова арганізаваныя і мелі сваё кіраўніцтва – “где се были соб-рали *старшие*”. Гэтыя “*старшие”* былі вядомы кіраўніцтву ваяводства: пан Іван Скірмант адзначаў, што іх прозвішчы былі названы ў лісце князя Друцкага-Сакалінскага да гараджан. Магчыма ў перспектыве стане мажлівым знайсці тэкст гэтага ліста і тады падзеі канца мая – пачатку чэрвеня 1621 г. у г. Полацку будуць раскрыты больш поўна.

Чытаючы гэты выпіс з гродскіх спраў Віцебскага ваяводства, складзены са слоў непасрэднага ўдзельніка падзей пана Івана Скірманта, выразна відаць разгубленасць прадстаўнікоў урады перад нечаканымі для іх паводзінамі полацкіх мяшчан – “пере*д* ты*м* того николи не бывалы*х*”. Цікава, што ваявода імкнуўся перадаць пратэстуючым заручны ліст, якім, верагодна, абяцаў дараванне палачанам, за нейкую, на думку ўладаў, правіннасць гараджан. Мяшчане, што сабраліся ў хаце (прысутнічалі там не толькі мужчыны, але і жанчыны) Ігната Вішні не хацелі ні гэтага даравання ад уладаў, ні перамоваў з імі. Старшага вознага Полацкага ваяводства “енерала” Івана Скірманта не падпусцілі нават да ганку хаты, дзе сабраліся “старшие” гарадской грамады г. Полацка. Больш за тое, прадстаўніка ўлады

[1] Енерал – галоўны сярод возных ваяводства. Возны – службовая асоба земскіх судоў у ВКЛ у XVI–XVIII стст.
[2] Ліст заручны гарантаваў ахову жыцця, здароўя і маёмасці аднойасобы ад пасягненняў другой, выдаваўся гаспадаром або мясцовымі ўладамі (ваяводам) пад страхам вялікага штрафу або смяротнага пакарання.



PolotskSU

мяшчане абражалі (“за великим крыком ѡтповедми и похвалками”), у яго адрас выказваліся пагрозы (“забитем на смерть и утопеньем”) [1, p. 7].

Пасля заявы І. Скірманта аб тым, што ён прыйшоў па даручэнні пана А. Жахоўскага і прынёс заручны ліст князя Друцкага-Сакалінскага з патрабаваннем спыніць недазволены сход, пратэстуючыя выслалі да яго на перамовы полацкага мяшчаніна Лук’яна Лукашэвіча. Апошні, атрымаўшы ад І. Скірманта заручны ліст, аднёс яго да лідараў гарадской абшчыны і праз нейкі час паведаміў, што людзі параіўшыся (“иж дей панове мещане вся братья наша ѡбмовившыся з собою”) [1, p. 7v] вырашылі перадаць полацкаму ваяводзе пісьмовы адказ на яго заручны ліст.

Калі ў той жа дзень пасля завяршэння службы (напэўна абедні. – *В.Г.*) у Полацкім Сафійскім саборы І. Скірмант у суправаджэнні вознага Полацкага ваяводства Яна Пнеўскага і полацкага шляхціца пана Васіля Раманавіча ізноў прыйшоў да дому Ігната Вішні, то адказу ад мяшчан не атрымаў. Не далі адказу мяшчане і на наступны дзень, 31 мая 1621 г., калі І. Скірман ізноў прыходзіў да хаты І. Вішні ў Полацку на вуліцы Вялікай. Больш за тое, мяшчане адмовіліся ад перамоваў і заявілі, што не збіраюцца разыходзіцца (“тых схажок через тот лист заручный им поданый занелати и поперестат не хотели”) [1, p. 7v].

І. Скірмант расцаніў такія паводзіны полацкіх мяшчан як абразу да вярхоўнай улады і асабіста караля, таму што ён выступаў перад гараджанамі як прадстаўнік кіраўніка дзяржавы (“енерал его королевское милости дворный”) [1, p. 7].

У выніку быў складзены адпаведны дакумент (“квіт”), які быў прадстаўлены для ўнясення для запісу ў гродскія кнігі Віцебскага ваяводства. Цікава, што І. Скірман звярнуўся ў Віцебскі гродскі суд. Можна выказаць меркаванне, што альбо з-за згаданых падзей гродскі суд у Полацку не збіраўся, альбо І. Скірмант не спадзяваўся, што ў Полацку яго “квіт” будзе прыняты для ўпісання ў гродскія кнігі.

Згаданы дакумент можа стаць своеасаблівым ключыкам для раскрыцця прычын і зместу супрацьстаяння паміж гарадской грамадой г. Полацка і ўладамі Полацкага ваяводства ўвесну 1621 г.

Тэкст дакумента:

p. 7. “Выпис с книг справ кгродских воеводства Витебского.

Лета ѡт нарожения сына божего тисеча шест сот двадцат первого, м(еся)ца юня третего дня.

На враде господарском кгродском Витебском передо мною, Александром Гурком, подвоеводим витебским, постановившисе ѡчевисто енерал воеводства Полоцкого Иван Скирмонт. Пры устном сознанью своем квит свой ку записанью до книг кгродских витебских дал, написаный в тые слова: я, Иван Скирмонт, енерал его королевское милости дворный, возный воеводства Полоцкого, сознаваю то тым моим квитом сознанья моего на писме иж року теперешнего тисеча шест сот двадцат первого м(еся)ца мая трыдцатого дня за везванем мене от слуги ясневелможного пана его милости князя Михала Друцкого Соколинского, воеводы Полоцкого, от пана Александра Жоховского, маючы пры собе людей добрых шляхту пана Василя Романовича а пана Мартина Юревича, того дня на дате вышей ѡписаного и с тою стороною былом в дому мещанина полоцкого в месте Полоцком на улицы Великой стоячом, на ймя у Игната Вишни. Там же знашол есми великое згромаженье людей музчызн и невест ѡ колко сот чоловека. А хотечы подать копию з листу его милости пана воеводиного заручного в том листе помененым мещаном полоцким, абы тых схажок покутных и перед тым того николи не бывалых занехали и бунтов жадных болш не чынили. Тако же и самый лист его милости пана воеводы тым собраным людем, в том листе помененым, ѡказат техснулся есми с тою стороною на кганок того дому, где за великою громадою людей, также и за недопущеньем мне, енералу, там далей до тое купы ити, где се были собрали старшие, помененые в том листе его милости пана воеводином менованые, за великим крыком ѡтповедми и похвалками, забитем на смерть и утопеньем, не могучы дойти и видети хтобы поводом той схажки был, мовилем абы ме пущоно, поведаючы жем прышол за посланьем мене ѡт помененого пана Александра //

p.7v // Жоховского, слуги его милости пана воеводиного, з листом заручным его м(и)лости пана воеводиным до тых мещан полоцких в том листе меновите описаных, абы они тых схажок покутных поперестали. Там же помененые мещане выслали до мене, енерала, неякого Лукьяна Лукашевича, мещанина полоцкого, который взявшы од мене копию с того листу его м(и)л(о)сти пана воеводиного, слово в слово списанную, и самый лист огледавшы перед тою всею громадою в том дворе будучою, в сени до помененых мещан понес. А потом знову вышедши тот же помененый Лукьян Лукашевич, мне, енералу, поведил: иж дей панове мещане вся братья наша ѡбмовившыся з собою, на письме ѡтказ наш его милости пану воеводе через тебе, п(а)не енерале, подадим. А потом того ж дня вышмененого я, енерал, маючы пры собе стороною возного воеводства Полоцкого Яна Пневского, пана Василя Романовича в час ѡтправованья хвалы божой литоргии в церкви соборной Светое Софии, ходил есми знову за посланьем пана Александра Жоховского до того дому Игната Вишни, хотечы отказ на письме ѡт помененых мещан до

PolotskSU

его милости пана воеводиного ѡдержати. В котором том дому знову такое ж або болшое згромаженье людей знашол есми. А потом и назавтрее, тоесть дня трыдцать первого мая зас знову за посланьем того ж пана Жоховского ходил, есми порану до помененого вишниного дому, хотечы яки от тых мещан на лист его милости пана воеводин заручный на писме ѡтказ мети, яко мне были ѡбещали и таковоеж згромаженье людей в том дому знашол, есми которы то помененые мещане полоцкие на тот лист его милости пана воеводы ничого недбаючы, зневажаючы в том зверхность его королевское м(и)л(о)сти, пана нашого милостивого, тых схажок черех тот лист заручный им поданый занелати и поперестат не хотели и ѡтказ на писме жадного его милости п(а)ну воеводе через мене, енерала, якосе были ѡбецали, дат не хотели и не дали, што я, енерал, и с тою стороною вышмененою видел и слышел и того своего виденья и слышенья сесь мой квит с печатью и с подписом руки моее, також //

р. 8. под печатми стороны шляхты, пры мне бывшой и с подписами руки которых з них писати умел, ку записаню до книг кгродских витебских дал есми. Писан року м(еся)ца и дня на дате вышей ѡписанного. У того квиту печет прыложоных тры, а подпис рук подписана есть тыми словы: Иван Скирмонт, енерал его королевской милости власною рукою; Василей Романович, рукою власною. Которое ж тое сознанье енерала звышречоного пры квите его учыненое и тот квит его до книг кгродских витебских есть записано, с которых и сей выпис под печатью моею врадовою велможному его м(и)л(ости) князю Михалу Друцкому Соколинскому воеводе Полоцкому есть выдан. Писан в Витебску».

Пячатка.

ЛІТАРАТУРА

1. Lietuvos Vastybes Istorijos Archyvas (LVIA) – Дзяржаўны гістарычны архіў Літвы. – F. 634 (Кансісторыя Віленскага уніяцкага епіскапства (1596–1839 гг.). Воп. 383. Матэрыялы па спрэчках полацкага архіепіскапа з Белазорамі і інш. Арк. 3.
2. Клімаў, І. Ліст / І. Клімаў // Вялікае княства Літоўскае : энцыкл.: у 2 т. : / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2006. – Т. 2. – С. 201.

## FROM THE EVERYDAY LIFE OF THE POLOTSK – NOTES OF IVAN SKIRMANT ABOUT "THE RIOT OF POLOTSK CITIZENS" IN 1621

***V. GOLUBEV***

*In the 20s. of the XVII century in Polotsk and Vitebsk region occurred a clear confrontation in society, associated with the confessional preferences of different population groups. In many ways, it was associated with the activities of Polotsk Uniate Archbishop Josaphat Kuntsevych (1618–1623). The events described in the published document, correlated in time with the Vitebsk uprising in 1623 and the other performances in the east of Belarus.*

PolotskSU